І КАМЕРЦЫЙНАЯ ВЫГАДА, І... ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЛІТЫКА

Планы супрацоўніцтва беларускіх прадпрыемстваў і «Раскосмаса» будуць рэалізоўвацца на прынцыпова новай аснове. Аб гэтым заявіў учора прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч на сустрэчы з кіраўніком Федэральнага касмічнага агенцтва Расіі («Раскосмас») Уладзімірам Папоўкіным, перадае БЕЛТА.

Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што работа з «Раскосмасам» — гэта і камерцыйная выгада, і дзяржаўная палітыка. Яна падтрымліваецца на ўзроўні ўрадаў дзвюх краін. «Гэта залог таго, што нашы планы будуць рэалізоўвацца на прынцыпова новай аснове», — сказаў прэм'ер-міністр Беларусі. «У выніку мы выходзім на ўзровень маёмасных адносін нашых сумесных прадпрыемстваў або ў будучым сумесных», — дадаў Міхаіл Мясніковіч.

Прэм'ер-міністр адзначыў, што ў час сустрэчы неабходна абмеркаваць пытанні інтэграцыі з беларускім «Пеленгам», і тое, што датычыцца групоўкі новых апаратаў. Размова пойдзе як аб дзеючай групоўцы, так і аб той, якую плануецца ўвесці ў эксплуатацыю праз 3-5 гадоў. «Мы павінны глядзець і на камерцыйны складальнік», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

ПАТРЫЯРХ КІРЫЛ ЗАКЛІКАЎ ВЕРНІКАЎ САБРАЦЬ СРОДКІ ДЛЯ НАРОДА СІРЫІ

«На працягу амаль двух гадоў у Сірыі працягваюцца ваенныя дзеянні. За гэты час у краіне загінулі дзясяткі тысяч чалавек, сярод якіх нямала старых, жанчын, дзяцей — мірных грамадзян, — сказана ў звароце першаіерарха Рускай праваслаўнай царквы, размешчаным на яе афіцыйным сайце і на сайце Беларускай праваслаўнай царквы. — Значную частку сірыйскага народа складаюць нашы з вамі адзінаверцы: у горадзе Дамаску знаходзіцца цэнтр аднаго з найстаражытнейшых праваслаўных патрыярхатаў — Антыахійскага. І зараз на вуліцах гэтага горада, які памятае апостала Паўла, подзвігі і працу старажытных святых, праліваецца чалавечая кроў. На гэтай біблейскай зямлі, дзе плячо ў плячо ў міры жылі праваслаўныя хрысціяне і мусульмане, сёння апаганьваюцца святыні, хрысціян гоняць з іх жылля, праследуюць, а нярэдка — аддаюць на катаванне і забіваюць».

Патрыярх заклікаў у бліжэйшую нядзелю ва ўсіх храмах Рускай праваслаўнай царквы арганізаваць збор сродкаў для сірыйскага народа. Грашовыя сродкі будуць накіраваны на рахункі Сінадальнага аддзела па царкоўнай дабрачыннасці і сацыяльным служэнні, якому даручана каардынаваць гэтую работу. Па завяршэнні царкоўнага збору сродкі будуць перададзены Антыахійскаму патрыярхату.

«Мы з вамі не можам спыніць гэтую вайну, але можам шчыра маліцца аб яе хуткім спыненні і аказаць дапамогу пакутным людзям, у тым ліку нашым братам-хрысціянам», — сказана ў звароце.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

СТВОРАНЫ БЕЛАРУСКА-ШВЕЙЦАРСКІ ДЗЕЛАВЫ САВЕТ

Дзеля пашырэння эканамічных сувязяў паміж Беларуссю і Швейцарыяй, стварэння новых сумесных прадпрыемстваў і стымулявання кантактаў прадстаўнікоў бізнесу дзвюх краін у Беларускай гандлёва-прамысловай палаце падпісаны дагавор аб стварэнні беларуска-швейцарскага дзелавога савета. Сустаршынямі яго сталі генеральны дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Электрычны транспарт» Уладзімір Кароль і ўладальнік швейцарскай кампаніі «Штадлер Рэйл Груп» Пітэр Шпулер.

У красавіку такая ініцыятыва была падтрымана падчас сустрэчы кіраўніка «Штадлер Рэйл Груп» з Прэзідэнтам Беларусі. Як паведаміў **першы намеснік старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Вячаслаў РЭУТ**, задачай новага савета стане павышэнне эканамічнай рэпутацыі нашай краіны сярод швейцарскіх бізнесменаў, паглыбленне ўзаемадзеяння ў гандлі і інвестыцыях і заахвочванне ў абмене эканамічнай інфармацыяй. Паводле слоў Петэра Шпулера, са стварэннем савета адкрываецца новая магчымасць для работы экспертаў. Як вядома, «Штадлер Рэйл Груп» з'яўляецца партнёрам нашай краіны ў пастаўках гарадскіх і прыгарадных электрацягнікоў, а таксама стваральнікам іх вытворчасці ў Мінскай вобласці сумесна з ААТ «Электрычны транспарт». У якасці перспектыўнага кірунку супрацоўніцтва разглядаюцца хімічная і фармацэўтычная галіна.

Пятро РАМАНЧУК.

ЗА ЎЖЫВАННЕ НАРКАРЭЧЫВАЎ ДАВЯДЗЕЦЦА АДКАЗАЦЬ

Міжнародныя эксперты прызнаюць, што барацьба з наркаманіяй прайграна. Аб гэтым сведчыць распаўсюджанасць наркотыкаў і наркаспажывання ў свеце. І ўсё таму, што размова ішла і ідзе аб вельмі прыбытковым бізнесе. Так, калі 1 тона гераіну ў Афганістане каштуе 9 тысяч долараў, то ў Маскве, скажам, гэта будзе ўжо 150 тысяч. Як бы там ні было, на дзяржаўным узроўні краіны проціпастаўляюць наркаспажыванню неверагодныя намаганні. У нас мяркуецца ісці па шляху ўкаранення больш жорсткіх мер пакарання, прычым нарэшце, размова зайшла аб магчымасці пакарання не толькі тых, хто распаўсюджвае, але і тых, хто спажывае.

Так, Міністэрства ўнутраных спраў выступае з ініцыятывай увядзення за ўжыванне наркотыкаў адміністрацыйнай адказнасці. У «Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях» мы ўнеслі норму аб тым, каб за ўжыванне наркасродкаў, псіхатропных рэчываў і іх аналагаў у грамадскім месцы, наступала адміністрацыйная адказнасць, — кажа намеснік начальніка ўпраўлення па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі МУС Беларусі Васіль ЛОСІЧ. — Нарматыўны акт прайшоў першае чытанне ў парламенце».

Таксама МУС ініцыяваў прадугледжанне пакарання за выраб наркотыкаў ва ўмовах лабараторыі. У краіне апошнім часам расце іх колькасць, як расце і колькасць спецыяльна абсталяваных памяшканняў па вырошчванні канопляў з высокай колькасцю канабіноідаў. Ёсць неабходнасць зрабіць больш сур'ёзнай адказнасць за перамяшчэнне наркотыкаў у межах Мытнага саюза. З моманту ўступлення ў Мытны саюз на тэрыторыі Беларусі было спынена 48 каналаў паступлення наркотыкаў. Галоўным чынам, з расійскага боку.

Пашырыць магчымасці барацьбы праваахоўнікаў з распаўсюджваннем насення маку дапаможа дэкрэт Прэзідэнта, які зараз знаходзіцца на разглядзе ў Савеце Міністраў. «Дэкрэт прадугледжвае магчымасць спагнання штрафу за распаўсюджванне насення маку ў памеры ад 1 да 8 тысяч еўра, — адзначае начальнік упраўлення па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі МУС Беларусі Мікалай КАРПЯНКОЎ. — Прадугледжана нават канфіскацыя кватэры, гаража, аўтамабіля, з дапамогай якіх ажыццяўлялася распаўсюджванне».

Наогул эксперты лічаць, што ў нашай рэспубліцы стабілізавалася сітуацыя з наркаманіяй. Работа вядзецца па чатырох кірунках: недаступнасць наркасыравіны на рынку, ранняя дыягностыка і выяўленне спажыўцоў, павышэнне ўзроўню рэабілітацыі апошніх, а таксама ў галіне навукі і заканадаўства. Разам з тым, толькі сёлета выяўлена 1800 злачынстваў, звязаных з накрабізнесам. 500 злачынстваў звязаны з незаконным абаротам наркарэчываў. На нашым наркарынку прысутнічаюць самыя розныя наркотыкі, гераін і метадон у тым ліку. Але, як запэўніваюць праваахоўнікі, яны на рынку не распаўсюджаны і лёгкадаступнымі іх не назавеш. Галоўным наркотыкам застаецца выраблены з насення маку опій. Другая сур'ёзная праблема — курыльныя сумесі. Для выяўлення гандляроў маніторыцца інтэрнэт, выяўляюцца сайты, на якіх ёсць падобная інфармацыя. «Усе асобы, якія займаюцца распаўсюджваннем курыльных сумесяў, будуць прыцягнуты да адказнасці», — сцвярджае спадар Карпянкоў. Ён таксама заўважыў, што «па марганцоўцы ў нас праблемы няма. Ва Украіне яна надуманая. Абарот марганцоўкі ў высокіх канцэнтрацыях кантралюецца». Увогуле ж размова ідзе пра звычайны «бытавы растваральнік», які проста можа прымяняцца падчас вырабу наркарэчываў.

— Летась агульная колькасць дыспансерных хворых на наркаманію вырасла на 881 чалавека, — расказвае загадчык сектара наркалагічнага маніторынгу Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя Аляксей КРАЛЬКО. — Найбольшая колькасць такіх людзей фіксуецца ў сталіцы, на Гомельшчыне. Даволі сур'ёзнай тэмай для размовы становіцца Салігорскі рэгіён.

На пачатак гэтага года ў сталіцы на ўліку ва ўрачоў-нарколагаў стаяла крыху больш за 7 тысяч хворых на наркаманію.

Святлана БАРЫСЕНКА.

■ Будзе свята!

БЕГАЦЬ, ЛАВІЦЬ РЫБУ І... ГЛЯДЗЕЦЬ САЛЮТ!

Адзначаць Дзень Незалежнасці ў сталіцы пачнуць яшчэ 29 чэрвеня: у 10 гадзін раніцы з плошчы Незалежнасці стартуюць дабрачынныя лёгкаатлетычныя спаборніцтвы з удзелам Дар'і Домрачавай, Юліі Несцярэнкі, Аляксандры Герасімені. Без мерапрыемстваў не абыдуцца і ўсе астатнія дні перад 3 ліпеня.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Так, 29-30 чэрвеня сталіцу чакае «вялікая рыбалка»: у акваторыі ракі Свіслач гэтымі днямі правядуць адкрыты кубак Мінска па спартыўнай лоўлі рыбы «Кубак RS». Канцэртная праграма святкавання Дня Незалежнасці пачнецца 1 ліпеня ў Палацы Рэспублікі, дзе ў 16.00 выступяць майстры мастацтваў Беларусі. Вечарам наступнага дня, у 20.30, запланавана адкрыццё плошчы Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. А непасрэдна ў Дзень Незалежнасці, 3 ліпеня, святкаванне пачнецца з парада войск Мінскага гарнізона і спартыўна-моладзевага шэсця на праспекце Пераможцаў. У 13 гадзін галоўныя падзеі перанясуцца на пляцоўку каля Палаца спорту, дзе пройдзе свята пад назвай «Ганаруся табой, Беларусь!» А завершыцца Дзень Незалежнасці традыцыйным канцэртам каля стэлы «Мінск — горад-герой» і салютам у 23 гадзіны. Святочная праграма на 3 ліпеня таксама запланавана ў кожным раёне сталіцы.

Гандаль побач з месцамі святочных мерапрыемстваў будзе весціся з мінімальнымі нацэнкамі. Па словах начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Мінгарвыканкама Сяргея Хільмана, выязныя гандлёвыя пункты будуць арганізаваны ў месах масавых гулянняў у раёнах горада, а таксама на буйных агульнагарадскіх і агульнарэспубліканскіх мерапрыемствах.

Ганна ГАРУСТОВІЧ

■

■ Чакаем!

СЁЛЕТА ПРАГНАЗУЕЦЦА НЕБЛАГІ ЎРАДЖАЙ ГРЫБОЎ І ЯГАД

Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя апублікавала прагнозы адносна ўраджайнасці сёлета грыбоў і ягад у лясах краіны. Яны былі зроблены на падставе маніторынгу, што праводзіўся ўвесну і ў пачатку лета лабараторыяй харчовых і лекавых рэсурсаў лесу Інстытута лесу НАН Беларусі на 7 пастаянных пунктах і 35 часовых пробных пляцоўках.

Даследаванні паказалі, што на поўначы і ў цэнтральных рэгіёнах краіны ўраджай чарніц прагназуецца вышэй за сярэдні (3 балы па пяцібальнай шкале). У Брэсцкай, Гомельскай і Гродзенскай абласцях ён будзе, верагодна, добрым (4 балы). Што датычыцца ўраджайнасці брусніц, дык яна паўсюдна чакаецца некалькі ніжэй за сярэднешматгадовы паказчык (2 балы). У Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях пры спрыяльных умовах надвор'я ўраджай гэтай ягады прагназуецца больш высокім (3 балы).

Прадуктыўнасць буякоў, што мяркуецца, вар'іруецца ў залежнасці ад вобласці: сярэдняя (3 балы) — на поўначы і ў цэнтральнай частцы краіны, добрая (4 балы) — у паўднёва-заходніх абласцях. Добрая (4 балы) ураджайнасць журавін чакаецца ў Брэсцкай, Віцебскай і Гомельскай абласцях. Менш (3 балы) гэтай ягады будзе, верагодна, у Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях.

Увогуле, адзначаюць спецыялісты, сёлета ўраджайнасць рэсурсаўтваральных ягад і грыбоў, згодна з папярэднімі (май — чэрвень) данымі даследаванняў, будзе не меншай за папярэдні. Для гэтага існуюць усе перадумовы: высокі і ўстойлівы снегавы покрыў 2012/2013 гадоў, шмат ападкаў у шэрагу рэгіёнаў, адсутнасць позневеснавых замаразкаў і туманаў. «Можна нават выказаць меркаванне, што адбудзецца павялічэнне ягаднай прадуктыўнасці за кошт павышэння ўраджайнасці журавін, брусніц, буякоў».

З-за добрай колькасці вільгаці вясной і магутных ліўневых дажджоў у маі — пачатку чэрвеня намячаецца неблагі ўраджай грыбоў. Гэта, у першую чаргу, датычыцца Мінскай, Гомельскай і Гродзенскай абласцей. У пачатку чэрвеня тут адзначана першая хваля баравікоў, абабкаў, падасінавікаў, маслякоў, лісічак. У далейшым, вядома, шмат што будзе залежаць ад умоў надвор'я. Пакуль жа спецыялісты мяркуюць, што ўраджай баравікоў, абабкаў і падасінавікаў па ўсіх абласцях чакаецца сярэднім (2 балы па трохбальнай шкале), а вось лісічак і восеньскіх апенек — высокі (3 балы). Пры дастатковай колькасці вільгаці летам (асабліва ў жніўні) ураджай усіх відаў грыбоў можа быць больш высокім.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

Фота Пятра ФАМІНА.

■ Зваротная сувязь

АЎТОБУСЫ ІДУЦЬ... І СПЫНЯЦЦА БУДУЦЬ

«Аўтобусы праходзяць, але... не спыняюцца». Пад такім загалоўкам 29.05.2013 г. у газеце быў змешчаны ліст Івана Казлоўскага. Іван Іванавіч (дарэчы, шчыры прыхільнік «Звязды») ад імя ўсіх сваіх землякоў хадайнічаў аб арганізацыі прыпыначнага пункта ў былым мястэчку Вішнявец Стаўбцоўскага раёна.

Як паведамілі ў адказе на публікацыю намеснік генеральнага дырэктара адкрытага акцыянернага таварыства «Мінскаблаўтатранс» Я.В. Ігнатаў і намеснік міністра транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь А.А. Шышко, пытанне, якое ўзнімалі вяскоўцы, разгледжана. Цяпер для ажыццяўлення паездак з Мінска ў в. Вішнявец можна скарыстацца аўтобусамі «Мінск — Клецк» і «Мінск — Нясвіж». Акрамя таго, па маршрутах «Нясвіж — Стоўбцы», «Стоўбцы — Ахрэмавічы» арганізаваны транспартныя зносіны з раённым цэнтрам. Іншымі словамі, нарматывы дзяржаўных сацыяльных стандартаў у галіне транспартнага абслугоўвання насельніцтва в. Вішнявец выконваюцца ў поўным аб'ёме.

Што да пытання аб увядзенні дадатковых прыпыначных пунктаў ва ўсе расклады руху, то (цытуем) «...адным з важных паказчыкаў, якія вызначаюць якасць абслугоўвання пасажыраў, з'яўляецца хуткасць руху аўтобусаў. Яе значэнне залежыць ад цэлага шэрагу фактараў — дарожных і кліматычных умоў, планіроўкі населеных пунктаў, інтэнсіўнасці руху і г.д. Перавышэнне сярэдняй дальнасці паездкі пасажыраў на міжгародніх маршрутах сведчыць аб мэтазгоднасці арганізацыі хуткасных або экспрэсных рэжымаў руху. Прыпыначныя пункты пры арганізацыі такіх маршрутаў усталёўваюцца ў месцах найбольшага пасажыраабмену з мэтай скарачэння агульнага часу на паездку не менш за 20—25% у параўнанні з аўтобусамі, якія працуюць у звычайным рэжыме.

Увядзенне дадатковых тарыфных прыпыначных пунктаў ва ўсе расклады руху аўтобусаў, якія выконваюць міжгароднія аўтамабільныя перавозкі пасажыраў у рэгулярных зносінах, павялічвае час руху аўтобуса, што прычыняе пэўныя нязручнасці пасажырам, якія едуць на далёкія адлегласці, і выклікае іх справядлівыя нараканні. Адток часткі пасажыраў па прычыне павелічэння часу ў дарозе негатыўным чынам адбіваецца на напаўняльнасці аўтобуса і, як вынік, на эканамічнай эфектыўнасці яго эксплуатацыі.

Разам з тым, пытанне, выкладзенае ў калектыўным звароце, прапрацавана з удзелам прадстаўнікоў арганізацый, якія выконваюць перавозкі пасажыраў у вышэйзгаданым напрамку. У выніку, з 12 ліпеня 2013 г. плануецца ўвесці тарыфны прыпыначны пункт «Вішнявец» у расклад руху аўтобусаў па маршрутах «Мінск — Пінск» (час адпраўлення з г. Мінска ў 12.00, 15.40, 17.30), «Мінск — Альшаны» (час адпраўлення з г. Мінска ў 10.00)».

Іншымі словамі, у хуткім часе гэтыя аўтобусы праз Вішнявец будуць не толькі праходзіць, — яны там будуць спыняцца.

На што, уласна, і спадзяваліся жыхары былога мястэчка і яго ваколіц, дасылаючы ліст у рэдакцыю.

■

■ Кватэрнае пытанне

МАЛАДАЯ СЯМ'Я — НЕ ШМАТДЗЕТНАЯ...

Мы жывём у доме, пабудаваным сельгасарганізацыяй, і хацелі б выкупіць яго з пераводам на нас запазычанасці па льготным крэдыце. Ці можна ў гэтым выпадку разлічваць на фінансавую дапамогу ў яго пагашэнні як маладой сям'і, у якой гадуецца малое дзіця?

С. Ляхаў, *Віцебскі р-н*

У адпаведнасці з падп. 1.4 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30.08.2005 № 405 «Аб некаторых мерах па будаўніцтве жылых дамоў (кватэр) у сельскагаспадарчых арганізацыях» (далей — Указ № 405) сельскагаспадарчыя арганізацыі, іншыя юрыдычныя асобы могуць ажыццяўляць перавод доўгу па льготных крэдытах, атрыманых імі ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Белаграпрамбанк» на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылога дома (кватэры), рэканструкцыю аб'екта пад жылое памяшканне, на грамадзяніна, якому гэты жылы дом (кватэра, жылое памяшканне) выдзелены для пражывання, па заяве гэтага грамадзяніна.

Перавод доўгу па такім крэдыце павінен ажыццяўляцца, зыходзячы з плацежаздольнасці грамадзяніна са згоды адкрытага акцыянернага таварыства «Белаграпрамбанк» з выплатай працэнтаў за карыстанне гэтым крэдытам у памеры 10% ад стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка, якая дзейнічае на дату пераводу доўга па льготным крэдыце, але не менш за 3% гадавых, і тэрмінам пагашэння крэдыту з моманту яго выдзялення — не больш за 20 гадоў. Для шматдзетных сямей стаўка за карыстанне крэдытам устаноўлена ў памеры 1% гадавых, а тэрмін пагашэння крэдыту — не больш за 40 гадоў. Пагашэнне запазычанасці па гэтым крэдыце і выплата працэнтаў за карыстанне ім ажыццяўляюцца роўнымі далямі на працягу перыяду пагашэння крэдыту.

Што датычыцца фінансавай дапамогі дзяржавы ў пагашэнні запазычанасці, то такая дапамога аказваецца на ўмовах і ў парадку, вызначаных ва Указе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2012 г . № 13 «Аб некаторых пытаннях аказання грамадзянам дзяржаўнай падтрымкі пры будаўніцтве (рэканструкцыі) або набыцці жылых памяшканняў».

У прыватнасці, шматдзетным сем'ям фінансавая дапамога аказваецца ў наступных памерах: пры наяўнасці траіх непаўналетніх дзяцей — 75% ад сумы запазычанасці, пры наяўнасці чацвярых і больш непаўналетніх дзяцей — 100% ад сумы запазычанасці па выданых крэдытах.

Маладым сем'ям фінансавая дапамога аказваецца пры нараджэнні (усынаўленні, удачарэнні) першага дзіцяці ў памеры 10% ад сумы запазычанасці і пры нараджэнні (усынаўленні, удачарэнні) другога дзіцяці — 20% ад сумы запазычанасці па выданых крэдытах.

Такім чынам, у адрозненне ад шматдзетных, маладым сем'ям фінансавая дапамога пры пагашэнні крэдыту аказваецца не пры наяўнасці непаўналетніх дзяцей, а ў выпадку іх нараджэння.

Віктар САВІЦКІ

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

У НАВАГРАДКУ АДРЭСТАЎРЫРУЮЦЬ ІНТЭР'ЕР ФАРНАГА КАСЦЁЛА

У Наваградку плануюць адрэстаўрываць інтэр'ер касцёла Праабражэння Гасподняга (Фарны касцёл), паведамілі ў Гродзенскай рымска-каталіцкай епархіі.

Адпаведны рэстаўрацыйны праект зацверджаны на рэалізацыю Міністэрствам культуры і атрымаў высокую ацэнку ў Ватыкане, дзе яго прадставілі сёстры-назарацянкі. Праект распрацаваны дзвюма выпускніцамі Беларускай акадэміі мастацтваў — Ганнай Радзюк і Наталляй Сталковіч. Абодва дызайнеры раней скончылі мастацка-рэстаўрацыйнае вучылішча ў Міры і даўно займаюцца тэмай Наваградскага касцёла, паведамляе епархія.

У адпаведнасці з канцэпцыяй акцэнт пры рэстаўрацыі будзе зроблены на тым, каб захаваць памяць аб разбураных у савецкія гады касцёлах і ўшанаваць памяць закатаваных гестапаўцамі ў 1943 годзе адзінаццаці манашак-назарацянак, прылічаных да ліку блажэнных. Новы від набудзе іх грабніца, з'явіцца надпіс на беларускай мове, а таксама надпіс з імёнамі манашак, схаваная за адмысловай канструкцыяй.

У адной з капліц, якая цяпер не выкарыстоўваецца, плануецца выставіць знойдзеныя мясцовымі жыхарамі дошкі з часцінкамі мошчаў святых, якія замуроўваліся ў сцены разбураных храмаў. Тут жа можна будзе ўбачыць аб'ёмныя вобразы страчаных культавых збудаванняў, што стане магчымым дзякуючы спецыяльнай падсветцы. Пачаць рэстаўрацыю плануецца ўжо гэтым летам, паведамілі ў епархіі.

БЕЛТА.

КУПЛЯЦЬ «З ЗЯМЛІ» НЕБЯСПЕЧНА

Гандаль прадуктамі харчавання ў несанкцыяніраваных месцах небяспечны, папярэджвае пакупнікоў Гродзенскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі і распачынае рэйды па яго спыненні.

Апошнім часам стыхійныя рынкі можна назіраць у Гродне каля многіх гандлёвых пунктаў. Прычым самі ж пакупнікі і стымулююць сваімі грашыма абарот патэнцыяльна небяспечнай прадукцыі. Нягледзячы на тое, што набыццё прадуктаў непасрэдна з зямлі альбо з бруднай скрыні, без захавання неабходнага тэмпературнага рэжыму (і, акрамя таго, у людзей без медыцынскага агляду) пагражае харчовым атручэннем, вострымі кішэчнымі інфекцыямі, туберкулёзам і іншымі захворваннямі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

КОНКУРС У ЛІЦЭЙ БДУ — 5,6 ЧАЛАВЕКА НА МЕСЦА

У Ліцэі БДУ падвялі вынікі прыёмнай кампаніі. Усяго сёлета пра сваё жаданне стаць ліцэістам заявілі 1407 чалавек (летась было 1358 ахвотных), у тым ліку 35 пераможцаў рэспубліканскіх прадметных алімпіяд, якія залічваюцца без уступных іспытаў.

Найбольшая колькасць заяў паступіла ад школьнікаў, якія планавалі паступаць на фізіка-матэматычны профіль, — 635. На паступленне ў хіміка-біялагічныя класы пададзена 366 заяў, у філалагічныя — 277, а грамадазнаўчы кірунак зацікавіў 120 чалавек. Усяго ў Ліцэй было прынята 288 чалавек, з якіх будуць сфарміраваны 12 класаў па 24 чалавекі. Такім чынам, агульны конкурс у Ліцэй склаў 5,6 чалавека на месца.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ДЫМ ПАДАРАЖЭЕ

Максімальныя рознічныя цэны на асобныя віды цыгарэт з фільтрам у ліпені павялічацца ў Беларусі на 0,9-30%. Аб гэтым паведамляецца на сайце Міністэрства па падатках і зборах.

Гаворка ідзе ў асноўным пра цыгарэты, якія вырабляюцца на тэрыторыі Беларусі. Іх выпускаюць ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» і ТАА «Тытунь-інвест». Цэны на большасць імпартаваных марак цыгарэт у ліпені застануцца на ўзроўні чэрвеня.

Больш за ўсё ў ліпені падаражэюць цыгарэты Magna Red і Magna Blue — на Br1500 да Br6450 за пачак. Акрамя таго, будуць устаноўлены цэны на шэраг новых відаў цыгарэт такіх марак, як Winston, Pall Mall, «Фэст».

Сяргей КУРКАЧ.

МАШЫНУ, УКРАДЗЕНУЮ Ў ВІЦЕБСКУ, ЗНАЙШЛІ Ў РАСІІ

Міліцыянеры Віцебскай вобласці і паліцэйскія са Смаленскай вобласці Расіі па «гарачых слядах» раскрылі крадзеж аўтамашыны «Аўдзі», якую ўгналі ў Віцебску.

— Аўто ўкралі ў жыхаркі Віцебска, 1984 года нараджэння. Яна расказала ў міліцыі, што машына, 1993 года выпуску стаяла каля дома на праспекце Будаўнікоў. Высветлілася, што дзяўчына правяла вечар у кампаніі знаёмых. А на наступны дзень не знайшла не толькі ключы ад аўто, але і саму машыну, — паведамілі супрацоўнікі аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама. — Аказалася, што трое маладых людзей знайшлі ключы ад аўтамашыны, якія выпалі з кішэні пацярпелай. Уначы яны перагналі «Аўдзі» ў горад Рудню Смаленскай вобласці. Там пакінулі машыну і вярнуліся назад.

Калі стала вядома аб начным ваяжы падазроных, інфармацыя аб крадзяжы транспартнага сродку была неадкладна перададзена расійскім калегам. І да аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў падключыліся супрацоўнікі крымінальнага вышуку Руднянскага аддзела ўнутраных спраў. Машыну знайшлі на адной з вулачак расійскага горада. Асобы ўсіх падазроных ва ўгоне ўстаноўлены. Адзін з іх, жыхар Віцебска, затрыманы. Заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ШТУРМ НАРКАПРЫТОНА З НЯБЁС

Міліцыі стала вядома, што насельнікі кватэры на пятым паверсе дзевяціпавярховіка ў Гомелі займаюцца вырабам наркотыкаў.

Падчас працэсу грамадзяне заўсёды былі максімальна асцярожнымі і блакіравалі металічныя дзверы. Менавіта таму аперацыю па ліквідацыі гэтага наркапрытона праваахоўнікі рыхтавалі асабліва старанна. Дзеянні ўсіх удзельнікаў аперацыі разлічваліся з матэматычнай дакладнасцю. Для сілавой падтрымкі была выклікана група супрацоўнікаў АМАПа, якія валодаюць навыкамі альпінісцкай падрыхтоўкі і штурму будынкаў. У момант, калі пачаўся выраб з насення маку наркотыкаў, у адчыненыя вокны пятага паверха, нібы з нябёс, уварваліся АМАПаўцы, забяспечыўшы ўваход аператыўнікаў. Уся аперацыя заняла некалькі хвілін. Як паведаміў начальнік упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі УУС Гомельскага аблвыканкама Юрый Маркевіч, сёлета толькі ў Гомелі выяўлена 145 злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам наркотыкаў, у тым ліку 53 факты іх збыту.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

МАЛАНКА ПАДПАЛІЛА ГАЗ

У Смалявіцкім раёне паблізу вёскі Пекалін з-за навальнічнага разраду загарэўся газ у зоне выкіду магістральнага газаправода.

— Пра здарэнне стала вядома ў 20.25. На месцы нашы работнікі ўбачылі адкрытае гарэнне паверх дзвюх скідавых свечак трубаправода. Вышыня полымя была каля 40 сантыметраў. Дыяметр свечак складаў 400 міліметраў. Загаранне адбылося на вышыні 6 метраў магістральнага трубаправода ў раёне кранавай пляцоўкі. Брыгада «Мінгаза» пацвердзіла, што адбываецца ўцечка і гарэнне газу, — паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях. — Бліжэй да апоўначы пры дапамозе стацыянарнага лафетнага ствала ад аўтацыстэрны МНС полымя было збіта. Потым краны былі загерметызаваныя. Падача газу спажыўцам не спынялася. Зніжэння ціску ў магістральным трубаправодзе не было. Мяркуецца, што прычынай загарання газу стаў навальнічны разрад маланкі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДОБРЫ ФЕЛЬЧАР БРАЛА ХАБАР,

а генеральны дырэктар «махляваў» з камандзіровачнымі.

Пракурорам Лепельскага раёна заведзена крымінальная справа ў дачыненні да жанчыны, якая, працуючы на пасадзе фельчара амбулаторыі ўрача агульнай практыкі № 1 Лепельскай цэнтральнай раённай бальніцы, брала хабар.

Паводле інфармацыі пракуратуры Віцебскай вобласці, мінулай восенню на працягу прыкладна месяца гэты медык атрымала загадзя абумоўленае ўзнагароджанне ад трох грамадзян. Апошнія грашыма дзякавалі за спрыяльнае вырашэнне пытанняў, звязаных з выдачай фіктыўных лісткоў непрацаздольнасці. Усяго такім чынам фельчар зарабіла 445 тысяч рублёў. А пракурорам Аршанскага раёна заведзена крымінальная справа ў дачыненні да мужчыны, які, працуючы генеральным дырэктарам таварыства «Аршанскі райаграсэрвіс», сумесна з кіроўцам гэтага ж прадпрыемства незаконна атрымаў камандзіровачныя на агульную суму больш за 2,1 мільёна рублёў — у выніку ўнясення фальшывых звестак у камандзіровачныя пасведчанні.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.